Скарына крочыць па Планеце

Францыск Скарына цікавы ўсяму свету. Пра гэта сведчыць увага да яго з боку замежных даследчыкаў. З Расійскай Федэрацыі, Чэхіі, Славакіі, Германіі, іншых краін свету… Мерапрыемствы, звязаныя з 500-годдзем беларускага кнігадрукавання, праходзяць і па лініі Міністэрства замежных спраў. Пра гэта расказвае начальнік галоўнага ўпраўлення шматбаковай дыпламатыі Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь Ларыса Леанідаўна Бельская:

Па лініі беларускіх замежных прадстаўніцтваў плануецца шэраг мерапрыемстваў.

Пасольства Беларусі ў **Азербайджане** плануе правядзенне тэматычнага ўрока ў Бакінскім славянскім універсітэце, прысвечанага 500-годдзю беларускага кнігадрукавання;

**Бельгія**. Правядзенне юбілейных мерапрыемстваў у супрацоўніцтве з Каралеўскай бібліятэкай Бельгіі ”Альберціна“ і ўладамі г. Альстом (радзіма галандскага гуманіста і першадрукара Д.Мартэнса).

**Германія**. Юбілейныя мерапрыемствы ў Дзяржаўнай бібліятэцы Баварыі і Бібліятэцы Верхнелужыцкага навуковага таварыства ў г. Гёрліц.

**Латвія**. Латвійская нацыянальная бібліятэка зацікаўлена ў правядзенні разам з беларускімі партнёрамі мерапрыемстваў, прымеркаваных да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання. Пад гэтыя праекты латвійскім бокам рэзервуецца час на працягу 2017 года.

Пасольства Беларусі ў **Расіі** плануе правядзенне на пляцоўцы Дзелавога і культурнага комплексу мерапрыемстваў, прысвечаных 500-годдзю беларускага кнігадрукавання, у тым ліку выставы-прэзентацыі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі ”Кніжнае спадчына Францыска Скарыны” і спектакля ”Скарына“ па п'есе Н.Рудкоўскага ў выкананні Магілёўскага абласнога драматычнага тэатра (верасень 2017 года, Масква).

Пасольства Беларусі ва **Украіне** плануе арганізаваць у другім паўгоддзі 2017 года ў Кіеве прэзентацыю кнігі А.Цітова ”Шляхамі

Францыска Скарыны“ пры удзеле Цэнтра беларускай культуры і мовы ім.У.Караткевіча Кіеўскага нацыянальнага ўніверсітэта

Пастаяннае прадстаўніцтва Беларусі пры **ААН у Жэневе** (Швейцарыя) прапрацоўвае правядзенне юбілейнага мерапрыемства ў супрацоўніцтве з Бібліятэкай ААН у Жэневе з прэзентацыяй факсімільнага выдання ”Кніжная спадчына Францыска Скарыны“ і яго перадачай **Бібліятэцы ААН**(верасень-кастрычнік)

МЗС падтрымлівае ініцыятыву ”Белгазпрамбанка“ па дэманстрацыі у Беларусі і за мяжой ”Малой падарожнай кніжкі“, арыгінальнага выдання Францыска Скарыны 1522 г., набытага банкам некаторы час таму. Прапрацоўваецца арганізацыя адпаведных мерапрыемстваў пры падтрымцы беларускіх замежных прадстаўніцтваў у Італіі, Літве, Польшчы, Чэхіі.